Голас душы

Яднанне ў любові

№ 11–12 (536)
Серада, 28 снежня 2016 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь

# ЗОРКІ НАРАДЖАЮЦЦА І ПАМІРАЮЦЬ, БЭТЛЕЕМСКАЯ ЗОРКА НЕ ПАМЕРЛА

*Увечары 24 снежня, у вігілію ўрачыстасці Нараджэння Пана, традыцыйна ва ўсіх касцёлах свету цэлебруецца прыгожая літургія. У нашай краіне штогод з розных касцёлаў ладзіцца тэлетрансляцыя вігілійнай святой Імшы. Сёлета яна праходзіла з парафіі Найсвяцейшай Панны Марыі Ружанцовай (Св. Дамініка) у Ракаве*



Урачыстую Эўхарыстыю ўзначаліў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

На пачатку святой Імшы арцыбіскуп разам з прэзбітэрамі, дыяканамі і асістай накіраваўся да галоўнага алтара, каб адтуль праз галоўную наву касцёла прынесці фігуру Дзіцяці Езуса да стаенкі, усталяванай перад касцёлам, і пакласці фігуру Хрыста ў яслі. Пасля гэтага Мітрапаліт Кандрусевіч асвяціў стаенку і прачытаў кароткую малітву.

Іерарх пакарміў жывёлаў, якія ў гэтыя святочныя дні будуць знаходзіцца побач з батлейкай вакол ракаўскага касцёла.

На заклік арцыпастыра «няхай засвеціць зорка Бэтлеема» з касцёла данёсся калядны спеў, а вежаў святыні паліліся гукі званоў, у неба паляцелі агні феерверкаў.

Пад урачысты спеў і звон званоў працэсія накіравалася ў касцёл, 110-годдзе якога адзначаецца сёлета.

Гучным хорам парафія заспявала «Хвала на вышынях Богу…».

«Сёння Касцёл скіроўвае наш позірк у напрамку Бэтлеема, дзе заззяла Бэтлеемская зорка, святло якой свеціць і сёння. Вядома, што зоркі нараджаюцца і паміраюць.

*Працяг на стар. 2*

# ЗОРКІ НАРАДЖАЮЦЦА І ПАМІРАЮЦЬ, БЭТЛЕЕМСКАЯ ЗАРКА НЕ ПАМЕРЛА

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Бэтлеемская зорка не памерла, яна свеціць, бо яе святло – гэта святло вечна жывога і актуальнага Евангелля», – адзначыў падчас гаміліі Мітрапаліт Кандрусевіч.

«Прыйсце Сына Божага ў свет звязана з аб’яўленым адразу пасля грэхападзення Адама і Евы Божым планам збаўлення чалавека. Таму Уцелаўленне – гэта таксама ўваход бязгрэшнага Бога ў сферу чалавечай грэшнасці з мэтай прыняць на сябе грахі чалавецтва і ў чалавечым целе перажыць драму аддалення і адначасова драму вяртання чалавека да Бога», – працягваў іерарх.

У гаміліі арцыпастыр звярнуў увагу на выклікі, з якімі сутыкаецца сучаснае грамадства. Адным з іх іерарх назваў крызіс сям’і і веры: «У сем’ях астывае дух малітвы. Бацькі ўсё радзей даюць прыклад сапраўднага рэлігійнага жыцця сваім дзецям. Змяняецца само паняцце сям’і, як Богам устаноўленага адзінага і непарушнага саюзу мужчыны і жанчыны з мэтай сумеснага жыцця і дапамогі адно аднаму, нараджэння патомства і яго выхавання. Замест гэтага заканадаўства палова краін Еўрасаюза ўжо легалізавала гомасексуальныя сужэнствы і пры гэтым з правам усынаўлення. Дзіцяці патрэбны бацька і маці. Хто ў такім выпадку іх заменіць? Хто ахіне ўсыноўленых дзяцей матчынай ласкай? Хто ў іх выхаванні заменіць патрабуючую любоў бацькі?»

Арцыпастыр выказаў таксама сваю занепакоенасць адносна стаўлення сучаснага грамадства да такога вялікага дару, як жыццё чалавека: «Самы вялікі Божы дар, якім з’яўляецца дар жыцця, дэвальвуецца. Жыццё становіцца таварам, які можна набыць і прадаць. Выкарыстоўваючы самыя новыя дасягненні генетыкі, ім можна маніпуляваць.

Распаўсюджваецца практыка абортаў, што з’яўляецца забіццём ненароджанага жыцця. Аборт – гэта акт агрэсіі супраць бездапаможнай і безабароннай чалавечай істоты. Ён вядзе да пагаршэння дэмаграфічнай сітуацыі з яе наступствамі, у тым ліку да міграцыйнага працэсу, які ў Заходняй Еўропе перарадзіўся ў вялікі крызіс.

З аднаго боку, міграцыя выклікана сітуацыяй у Сірыі, на Блізкім Усходзе і ў некаторых краінах Азіі. Але з іншага боку, Еўропа патрабуе гэтай міграцыі. Гэта наступства дэмаграфічнага крызісу: стары кантынент старэе і патрабуе новых рук для працы».

На заканчэнне літургіі Мітрапаліт Кандрусевіч павіншаваў усіх са святамі: «У гэтае радаснае і збаўчае свята Божага Нараджэння сардэчна віншую ўсіх вас і жадаю, каб Езус сваёю ласкай нарадзіўся ў вашых душах і быў прысутны на вашых жыццёвых шляхах як той, які з’яўляецца дарогай, праўдай і жыццём».

Завяршылася святочная Эўхарыстыя дзяленнем аплаткай пад калядныя спевы.

*Паводле Catholic.by*







# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ АРЦЫБІСКУПА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА БОЖАЕ НАРАДЖЭННЕ 2016

*«Уцелаўленне – гэта ўваход бязгрэшнага Бога ў сферу чалавечай грэшнасці з мэтай прыняць на сябе грахі чалавецтва і ў чалавечым целе перажыць драму аддалення і адначасова драму вяртання чалавека да Бога»*

## ДАЗВОЛЬЦЕ ЯМУ ПРЫЙСЦІ

*«Хрыстус нарадзіўся, Бог аб'явіўся!»*

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры, людзі добрай волі!

1. Сардэчна вітаю вас усіх гэтым святочным воклічам і віншую з радасным і поўным духоўнага зместу святам Божага Нараджэння, калі мы адзначаем таямніцу Уцелаўлення Сына Божага.

Сёлетнія разважанні пра цуд Бэтлеемскай ночы, які меў месца больш за 2000 гадоў таму, дазвольце распачаць наступным аповедам. Падчас калядных адведзінаў святар пастукаў у дзверы аднаго дома. Ніхто не адказаў, хаця было чутна, як працуе радыё. Ён пастукаў мацней. Тое самае. Трэці раз. Нічога. Тады ён узяў сваю візітоўку і напісаў на ёй словы за Святога Пісання: «Вось, стаю каля дзвярэй і стукаюся; калі хто пачуе голас Мой і адчыніць дзверы, увайду да яго і буду вячэраць з ім, і ён са Мною» (Ап 3, 20).

У наступную нядзелю святар убачыў сваю візітоўку ў кошыку з ахвярамі, якія збіраюцца падчас набажэнства. Там было напісана: «Я бачыў цябе праз акно, але пабаяўся адчыніць дзверы».

2. Гэты аповед мае цесную сувязь з таямніцай Уцелаўлення і прыняцця яе людзьмі. Марыя з Юзафам шукаюць месца, дзе мог бы нарадзіцца Збаўца свету. Яны стукаюць у дзверы розных дамоў і гатэляў, але нідзе няма месца для іх (пар. Лк 2, 7). Езус прыйшоў да сваіх, але яны Яго не прынялі (пар. Ян 1, 10).

Гісторыя Бэтлеемскай начы не завяршылася. Яна паўтараецца. Езус і сёння стукае ў дзверы нашых сэрцаў і хоча нас адведаць, хоча знайсці ў іх месца, хоча быць з намі, хоча адарыць нас сваім словам і збаўчай ласкай.

Ці адчыненыя дзверы нашых сэрцаў? Ці чакаем мы Езуса? Ці ахвотна мы Яго прымаем? Гэтае пытанне сёння з'яўляецца як ніколі актуальным. Бог мае свой план адносна кожнага з нас. Ён няспынна дзейнічае ў гісторыі. Услухаемся толькі: Ён стукае ў дзверы нашых сэрцаў. Ці гатовыя мы адчыніць?

3. Святы Айцец Францішак падчас сёлетняга Сусветнага Дня Моладзі ў Кракаве прыгадаў словы св. Яна Паўла II з гаміліі падчас інаўгурацыйнай Імшы яго Пантыфікату: «Адчыніце дзверы Хрысту!» – і дадаў, што мы павінны пачуць рэха заклiку Вялікага Пантыфіка (пар. PFwP, с. 100). Яно павінна гучаць у нашых сэрцах. Хрыстус павінен там знайсці месца, бо толькі ў Ім чалавек можа пазнаць сябе і толькі Ён дае надзею.

У нашым жыцці мы заўсёды чагосьці жадаем і да чагосьці імкнёмся. Найчасцей хочам быць багатымі, славутымі, папулярнымі. Гэта натуральна, бо чалавек імкнецца да лепшага жыцця і хоча ўдасканальвацца. Аднак мы добра ведаем, што спаўненне ўсіх гэтых жаданняў не можа нас задаволіць да канца, аб чым сведчыць штодзённае жыццё.

Таму нашым самым запаветным жаданнем павінна быць імкненне дасягнуць таго, што будзе працягвацца вечна. У гэтым мы адрозніваемся ад іншых стварэнняў. Малады закаханы чалавек хоча, каб любоў ніколі не завяршылася і не задавальняецца толькі часовымі пачуццямі. Таму, каб быць сапраўды шчаслівым, чалавек павінен жадаць вечнага Бога. Не супакоіцца маё сэрца, пакуль не спачне ў табе, Божа, кажа Св. Аўгустын.

4. Нараджэнне Хрыста – гэта ўваход бязмежнага Бога ў вобразе малога бездапаможнага дзіцяці ў гісторыю чалавецтва, каб яно спачыла ў ім. Дзякуючы таямніцы Уцелаўлення Бог стаў чаканым Эммануэлем – Богам з намі. Ён увайшоў у нашае жыццё, каб дзеля нас перажыць узніклую з-за граху драму адносін чалавека з Богам з мэтай усталявання новых адносін паміж імі.

Гэта мог учыніць толькі ўцелаўлёны Сын Божы і ніхто іншы. Ніхто, акрамя Яго, так не перажыў драму адыходу чалавека ад Бога, як гэта перажыў Хрыстус. Ніхто таксама не мог паўней перажыць драмы вяртання чалавека да Бога, як Ён, які дзеля гэтага ахвяраваў сваё жыццё на дрэве крыжа.

Прыйсце Сына Божага ў свет звязана з аб'яўленым адразу пасля грэхападзення Адама і Евы Божым планам збаўлення чалавека. Таму Уцелаўленне – гэта таксама ўваход бязгрэшнага Бога ў сферу чалавечай грэшнасці з мэтай прыняць на сябе грахі чалавецтва і ў чалавечым целе перажыць драму аддалення і адначасова драму вяртання чалавека да Бога.

Дзякуючы таямніцы Уцелаўлення Сын Божы прыйшоў на нашу зямлю і стаў нашым спадарожнікам на шляхах нашага жыцця. Ён – Божае Слова, якое стала целам.

*Працяг на стар. 4*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ АРЦЫБІСКУПА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА БОЖАЕ НАРАДЖЭННЕ 2016

*Працяг. Пачатак на стар. 3*

Ён – поўня быцця, бо «ўсё праз Яго сталася, і без Яго нічога не сталася з таго, што сталася” (Ян 1, 3). Ён – выява нябачнага Бога, якога ніхто і ніколі не бачыў. Толькі Адзінародны Сын Яго аб'явіў (пар. Ян 1, 18).

5. Божае Нараджэнне – гэта магчымасць, якая аднаўляецца кожны год, каб паглыбіць прысутнасць Бога сярод нас і нашу еднасць з Ім.

Гэтае свята нагадвае пра тое, што нашае жыццё не можа ў поўні існаваць без пастаянных адносін з Богам.

Перажываючы радасць Бэтлеемскай ночы, мы таксама павінны памятаць, што Бог выбраў планету Зямля, каб яна была сціплым домам для Яго ўцелаўлёнага Сына. У гэтым доме Ён жыў і ў ім аддаў сваё жыццё дзеля нас і нашага збаўлення. Учыніў гэта для таго, каб нанова адарыць чалавецтва поўняю жыцця, незалежна ад паходжання, колеру скуры, мовы, бо ў Яго вачах кожны чалавек і кожны народ з'яўляецца надзвычайнай каштоўнасцю, і дзеля кожнага з нас Ён прыйшоў у гэты свет.

6. Таму галоўным пасланнем Божага Нараджэння з'яўляецца запрашэнне да новага і настойлівага намагання заўсёды заставацца перад абліччам Бога, каб пазнаваць Яго волю і жыць згодна з ёй. Гэтым пасланнем таксама з'яўляецца аднаўленне нашага рэлігійнага і духоўнага жыцця ў адпаведнасці з духам Евангелля і вучэння Касцёла.

А аднаўляць ёсць што.

Сучасны свет усё больш і больш акунаецца ў розныя крызісы, ліхаманкава шукае выйсця з іх і, абапіраючыся толькі на свае чалавечыя сілы і магчымасці, не можа знайсці. Прычыну ўсіх крызісаў найперш неабходна шукаць у маральным крызісе, які завалодаў чалавецтвам, а выйсце – у Божай дапамозе. Не без прычыны Езус сказаў, што без Яго нічога не зможам зрабіць (пар. Ян 15, 5).

А быць з Ім азначае жыць паводле Божага закону. Нярэдка можна пачуць, што Божы закон абмяжоўвае свабоду чалавека. Аднак ніхто не кажа, што дарожныя знакі абмяжоўваюць свабоду вадзіцеля. Яны патрэбныя для таго, каб бяспечна весці аўтамабіль і даехаць да мэты нашага падарожжа. Падобна і Божы закон дадзены не для абмяжоўвання свабоды чалавека, але для яго дабра, каб ён мог бяспечна дайсці да мэты свайго зямнога падарожжа ў шчаслівую вечнасць.

Сучасныя тэндэнцыі імкнення да свабоды без адказнасці і непрызнанне існавання абсалютнай праўды, якою з'яўляецца Божы закон, з'яўляюцца галоўнай прычынай многіх крызісаў.

Адным з найбольш хвалюючых з'яўляецца крызіс сям'і як галоўнай клеткі кожнага грамадства. Разводы становяцца нормай, якая вядзе не толькі да асабістай трагедыі мужчыны і жанчыны, але і дзяцей, якія застаюцца сіротамі пры жывых бацьках.

Змяняецца само паняцце сям'і, як Богам устаноўленага адзінага і непарушнага саюзу мужчыны і жанчыны з мэтай сумеснага жыцця і дапамогі адно аднаму, нараджэння патомства і яго выхавання. Замест гэтага заканадаўства палова краін Еўрасаюза ўжо легалізавала гомасексуальныя сужэнствы і пры гэтым з правам усынаўлення. Дзіцяці патрэбны бацька і маці. Хто ў такім выпадку іх замяніць? Хто ахіне ўсыноўленых дзяцей матчынай ласкай? Хто ў іх выхаванні заменіць патрабуючую любоў бацькі?

У сем'ях астывае дух малітвы. Бацькі ўсё радзей даюць прыклад сапраўднага рэлігійнага жыцця сваім дзецям.

Замест таго, каб усёй сям'ёй у нядзелю ісці ў касцёл, яны наведваюць супермаркеты, стадыёны, канцэртныя залы. Ніхто не кажа, што яны не патрэбны, але яны не могуць пераўтварацца ў новыя касцёлы, дзе можна знайсці ўсё, акрамя Бога. Бацькі павінны памятаць, што яблык ад яблыні не далёка коціцца, і таму прыклад іх рэлігійнага жыцця вельмі важны ў выхаванні маладога пакалення.

Самы вялікі Божы дар, якім з'яўляецца дар жыцця, дэвальвуецца. Яно становіцца таварам, які можна набыць і прадаць. Выкарыстоўваючы самыя новыя дасягненні генетыкі, ім можна маніпуляваць. Распаўсюджваецца практыка абортаў, што з'яўляецца забіццём ненароджанага жыцця. Аборт – гэта акт агрэсіі супраць бездапаможнай і безабароннай чалавечай істоты. Ён вядзе да пагаршэння дэмаграфічнай сітуацыі з яе наступствамі, у тым ліку да міграцыйнага працэсу, які ў Заходняй Еўропе перарадзіўся ў вялікі крызіс. З аднаго боку, міграцыя выклікана сітуацыяй у Сірыі, на Блізкім Усходзе і ў некаторых краінах Азіі. Але з іншага, Еўропа патрабуе гэтай міграцыі. Гэта наступства дэмаграфічнага крызісу: стары кантынент старэе і патрабуе новых рук для працы. Еўропа, паводле слоў папы Францішка, стала няплоднай бабуляй, з усімі выплываючымі з гэтага наступствамі.

*Працяг на стар. 5*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ АРЦЫБІСКУПА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА БОЖАЕ НАРАДЖЭННЕ 2016

*Працяг. Пачатак на стар. 3-4*

Стары кантынент перажывае працэс дэмаграфічнага самагубства, выйсця з якога не гарантуюць ні палітычныя, ні эканамічныя рашэнні, бо гэта праблема сэрца, праблема духоўнага стану грамадства.

Касцёл цвёрда стаіць на прынцыпах абароны жыцця і таму ў сваім вучэнні выказваецца за забарону смяротнага пакарання. Жыццё – гэта самы вялікі і каштоўны Божы дар. Бог даў, і ніхто не мае права яго адабраць. Вядома, што кожнае злачынства, асабліва забойства, – гэта зло, бо ніхто не верне жыцця. Аднак, у наш час існуе дастатковa метадаў абясшкодзіць злачынца так, каб ён нікому не мог прычыніць зла і адбываў пажыццёвае зняволенне. Устрыманне ад смяротнай кары адпавядае годнасці чалавечай асобы, умовам агульнага дабра і з’яўляецца выразам павагі да права кожнага чалавека на жыццё.

Мэтай адмены смяротнага пакарання з'яўляецца абарона чалавечай годнасці, на якую мае права таксама і забойца, як вучыць Св. Ян Павел II (пар. EV 56. 9). Трэба памятаць і пра тое, што існуе магчымасць судовай памылкі, якую пасля выканання смяротнага пакарання не магчыма выправіць.

Паводле папы Францішка, смяротнае пакаранне абсалютна не прымальна. Яно зневажае непарушнасць жыцця і годнасці чалавечай асобы, супярэчыць Божаму плану адносна канкрэтных людзей і Ягонай міласэрнасці. Божы закон «не забівай» мае абсалютную вартасць і датычыць як невінаватых, так і вінаватых. Таму адмена смяротнага пакарання павінна стаць фундаментальнай каштоўнасцю грамадства.

Нагадваючы пра сучасныя праблемы, асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на мас-медыі, роля якіх з кожным днём расце. Яны фарміруюць грамадскую думку і таксама чалавека. Сучасная моладзь выхавана на СМІ. І таму тое, якой яна будзе, шмат у чым будзе залежаць ад мас-медый і таго, што яны нясуць свету. На жаль, вельмі часта замест таго, каб несці агульначалавечыя і маральныя каштоўнасці, СМІ нясуць антыкаштоўнасці.

Падобна і з культурай, якая ўсё часцей прапануе амаральныя сцэны, на якіх таксама выхоўваецца чалавек.

Узнікаюць новыя багі, якімі з’яўляюцца славутыя артысты, спартсмены, палітыкі, багацце і г. д. Гэта праўда, што патрэбны вялікія намаганні, каб быць славутым, але нельга абагаўляць чалавека і пакланяцца багаццю: Богу аднаму будзеш кланяцца, кажа Хрыстус (пар. Мц 4, 10).

Вялікую трывогу выклікае супярэчная духу хрысціянства практыка магіі, акультызму, астралогіі, азартных гульняў, вядзьмарства, хэлоўіну і іншага. Усё гэта распаўсюджваецца з вялікай моцай і ўцягвае чалавека ў новыя залежнасці, з якіх цяжка выбрацца і якія вядуць да жыццёвых трагедый.

На жаль, гэтыя і многія іншыя паталогіі сучаснага свету ўспрымаюцца як прагрэс, праяўленне свабоды і рэалізацыя правоў чалавека. Усё гэта чыніць залежным, а не свабодным, і вядзе да зневажання чалавечай годнасці, якая становіцца запраграмаваным аб’ектам, з якім можна чыніць усё што хочацца, як кажа папа Францішак.

Нашы продкі падчас ганенняў на Касцёл захавалі веру і перамаглі несвабоду, а ці пераможам мы са свабодай, якая з’яўляецца вельмі патрабавальным выклікам? Сучасны свет маральна сапсаваны, што можа прывесці да трагедыі. Падобна таму, як законы фізікі няўмольныя і немагчыма доўга стаяць на нахіленай паверхні, таксама немагчыма нармальна жыць, не захоўваючы Божы закон.

6. Дзе шукаць выйсця ў такой сітуацыі, якая ўсё больш нагадвае пра маральную ноч?

Сёння Касцёл скіроўвае наш позірк у напрамку Бэтлеема, дзе заззяла Бэтлеемская зорка, святло якой свеціць і сёння. Вядома, што зоркі нараджаюцца і паміраюць. Бэтлеемская зорка не памерла, яна свеціць, бо яе святло – гэта святло вечна жывога і актуальнага Евангелля.

Каляды прыходзяцца на час зімняга сонцастаяння – час парадоксу, калі святло прабіваецца падчас самай цёмнай пары года. Падобна таму, як таямніча адраджаецца святло сонца, таксама Божае Нараджэнне дае нам магчымасць духоўна адрадзіцца і ўзрастаць у Божым святле, якое свеціць у духоўнай цемры сучаснага свету.

Таму Нараджэнне Пана – гэта свята адраджэння духоўнай іскры ўнутры нас, нават падчас цёмнай халоднай духоўнай зімы і знак новай надзеі, нават насуперак надзеі (пар. Рым 4, 18).

7. Божае Нараджэнне – гэта не толькі і не столькі святкаванне гістарычнага факту Увасаблення Сына Божага, які змяніў ход гісторыі чалавецтва. Гэта таксама ўсведамленне таго, што ў гэтую Святую Ноч Ён напаўняе нашы душы сваёй збаўчай ласкай.

*Працяг на стар. 6*

# ПАСТЫРСКАЕ ПАСЛАННЕ АРЦЫБІСКУПА ТАДЭВУША КАНДРУСЕВІЧА НА БОЖАЕ НАРАДЖЭННЕ 2016

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 3-5*

Вядомы нямецкі святар і паэт XVII стагоддзя Анджэлус Сілезіюс казаў: калі б Хрыстус нарадзіўся ў Бэтлееме нават тысячу разоў, але не нарадзіўся ў нашым сэрцы, то і гэта не дапамагло б нашай душы.

Перажываючы радасць свята Божага Нараджэння мы павінны засяродзіцца не толькі і не столькі на знешнім святкаванні, колькі на яго сутнасці: ці дазваляем мы Езусу нарадзіцца свёй ласкай у нашых сэрцах і душах, каб Яго духоўная энергія дапамагла нам вырашыць праблемы і крызісы, з якімі мы сустракаемся.

Словы Вялікага Папы св. Яна Паўла II «Не бойцеся! Адчыніце дзверы Хрысту!» павінны адгукнуцца моцным рэхам у нас саміх і на нашай зямлі, каб мы сапраўды адчувалі сябе дзецьмі Божымі, вызваленымі Хрыстом да свабоды (пар. Гал 5, 1), каб бараніць і змагацца за яе. Гэта няпроста. Для гэтага неабходна быць адважным, замяніць выгодны канапавы стыль жыцця на пару абутку, каб ісці па шляхах Хрыста, па дарогах, якія адкрыюць новыя гарызонты, з мэтай адшукаць радасць, якая нараджаецца з любові Бога, як кажа папа Францішак (пар. PFwP, с. 113).

У цішыні Бэтлеемскай ночы ўважліва прыслухаемся і пачуем стук Езуса ў дзверы нашых сэрцаў. Не баймася прыняць Яго, і Ён духоўна нас пераменіць і адорыць новай надзеяй.

8. Браты і сёстры!

У гэтае радаснае і збаўчае свята Божага Нараджэння сардэчна віншую ўсіх вас і жадаю, каб Езус сваёю ласкай нарадзіўся ў вашых душах і быў прысутны на вашых жыццёвых шляхах як той, які з’яўляецца дарогай, праўдай і жыццём (пар. Ян 14, 6).

Віншую хрысціян іншых канфесій, якія сёння святкуюць з намі Божае Нараджэнне. Жадаю ім поўні святочнай радасці і дароў Нованароджанага Збаўцы. Няхай наш супольны спеў «Хвала на вышынях Богу, а на зямлі супакой людзям добрай волі» (Лк 2, 14) напаўняе нашу Айчыну.

Са словамі сардэчнага прывітання і найлепшых пажаданняў звяртаюся да праваслаўных братоў і сясцёр, якія перажываюць Адвэнт. Няхай ён стане для вас благаслаўлёным часам падрыхтоўкі да святаў Божага Нараджэння паводле Юліянскага календара, каб праз два тыдні мы аб’ядналіся ў супольным святкаванні радаснай таямніцы Уцелаўлення Сына Божага.

Віншую ўсіх людзей добрай волі. Каляды належаць ўсяму свету, бо Сын Божы стаўся чалавекам дзеля збаўлення ўсіх людзей.

Усім вам, дарагія браты і сёстры, людзі добрай волі, суайчыннікі, жадаю поўні ласкі Немаўляці Езуса і Яго супакою на святы Божага Нараджэння і на надыходзячы Новы 2017 Год!

Свае святочныя пажаданні ўмацоўваю благаслаўленнем у імя Айца, † і Сына, і Духа Святога, а на знак еднасці дзялюся традыцыйнай аплаткай. Амэн.

*Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч*
*Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі*



# ЗНАЁМІМСЯ З УДЗЕЛЬНІКАМІ «НЯСПЫННАЙ МАЛІТВЫ ЗА БЕЛАРУСЬ»: КС. ДЗМІТРЫЙ ІВАНОЎ

*Вясной 2015 года пачалася кругласутачная «Няспынная малітва за Беларусь». Вернікі розных канфесій паступова далучаліся да малітвы, абіраючы свае малітоўныя 60 хвілін за Радзіму*



Удзельнікі малітвы ў асноўным мужна трываюць у ёй, нават калі іх час выпадае на чатыры раніцы. Але ці так усё лёгка, ці сапраўды атрымліваецца не забыцца на гэты час, ці няма знешніх ці ўнутраных перашкод?

Часам некаторыя людзі адмаўляюцца ад малітвы, на іх месца знаходзяцца новыя ахвотнікі.

У падтрымку і дзеля заахвочвання новых удзельнікаў гэтай важнай ініцыятывы прапаноўваем знаёмства з некаторымі людзьмі, якія трываюць у гэтым адказным абавязку.

Сёння гутарым з ксяндзом Дзмітрыем Івановым, які нясе служэнне ў касцёле Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску. Ксёндз Дзмітрый скончыў семінарыю ў Беластоку. Яго продкі паходзяць з Лагойшчыны.

Вясной 2015 года пачалася кругласутачная «Няспынная малітва за Беларусь». Вернікі розных канфесій паступова далучаліся да малітвы, абіраючы свае малітоўныя 60 хвілін за Радзіму.

Удзельнікі малітвы ў асноўным мужна трываюць у ёй, нават калі іх час выпадае на чатыры раніцы. Але ці так усё лёгка, ці сапраўды атрымліваецца не забыцца на гэты час, ці няма знешніх ці ўнутраных перашкод?

Часам некаторыя людзі адмаўляюцца ад малітвы, на іх месца знаходзяцца новыя ахвотнікі.

У падтрымку і дзеля заахвочвання новых удзельнікаў гэтай важнай ініцыятывы прапаноўваем знаёмства з некаторымі людзьмі, якія трываюць у гэтым адказным абавязку.

Сёння гутарым з ксяндзом Дзмітрыем Івановым, які нясе служэнне ў касцёле Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску. Ксёндз Дзмітрый скончыў семінарыю ў Беластоку. Яго продкі паходзяць з Лагойшчыны.

***– Ксёндз Дзмітрый, раскажыце колькі словаў пра сябе. Чым Вы цікавіцеся, чым займаецеся?***

– Я – святар. Паходжу з Мінска, у Мінску нарадзіўся, тут прайшло маё дзяцінства і юнацтва. Летам, канешне ж, ездзіў у вёску, да сваёй бабулечкі. Там я адчуў любоў да Беларусі, да гэтай зямлі, да простай мовы.

Мае інтарэсы таксама крыху з гэтым звязаныя – я люблю падарожнічаць, цікаўлюся архітэктурай. Асабліва захапляюся культавымі пабудовамі, нашым віленскім барока, да якога мы так прызвычаіліся. У які куточак Беларусі не паедзеш – заўсёды яго знойдзеш. А саму Вільню калі наведваеш, дык аж дух захоплівае. Таксама мне падабаецца неаготыка, касцёлы на поўначы Беларусі: Іказнь, Слабодка, Відзы. Тыя ж самыя Гервяты трэба прыгадаць – прыгажэйшы касцёл у стылі неаготыкі.

Наша Беларусь багатая на прыгажосць. Дарэчы, першыя думкі пра святарства да мяне прыйшлі, калі маліўся ля сцен былога касцёла святога Мацвея ў Раўбічах, што за 15 кіламетраў ад вёскі маёй бабулі.

***– А чаму Вы прынялі рашэнне маліцца за гэтую зямлю, за Беларусь?***

– Для мяне гэта заўсёды было актуальна. Я вучыўся ў Польшчы і звярнуў увагу, што ў Польшчы Касцёл вельмі патрыятычны. Святар прысутнічае на дзяржаўных святах і прамаўляе патрыятычныя казанні, гаворыць пра любоў да Айчыны. Мяне гэта вельмі вабіла, і я разважаў, чаму ў нас такога няма, чаму мы баімся часамі адно-два словы сказаць пра Беларусь, што Беларусь – наша Бацькаўшчына, што мы – беларусы, што трэба любіць сваю Айчыну і сваю мову. Таму я вырашыў далучыцца да Няспыннай малітвы. Для мяне прыклад патрыятычнага служэння – гэта кс. Ежы Папялушка. Я вучыўся недалёка ад той мясцовасці, дзе ён нарадзіўся. Гэта каля Беластока.

Мы не павінны гэтага цурацца. Малітва за Беларусь, малітва за Бацькаўшчыну – гэта абавязак кожнага жыхара гэтай зямлі. Гэта чацвёртая запаведзь: любі маці і бацьку свайго, тут жа таксама – любі сваю зямлю, культуру, любі родную краіну, у якой ты жывеш. Хрысціяне мусяць мець патрыятызм.

*Працяг на стар. 8*

# ЗНАЁМІМСЯ З УДЗЕЛЬНІКАМІ «НЯСПЫННАЙ МАЛІТВЫ ЗА БЕЛАРУСЬ»: КС. ДЗМІТРЫЙ ІВАНОЎ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 7*

***– Які рытм Вашага жыцця?***

– У Чырвоным касцёле, канешне, рытм жыцця вельмі напоўнены. Заўсёды шмат людзей, службаў, толькі ў будні дзень шэсць службаў. Заўсёды ёсць хтосьці да споведзі, таксама пахаванні, шлюбы, хросты, намашчэнне хворых, размовы з рознымі людзьмі, якія прыходзяць са сваімі патрэбамі. Такое наша святарскае жыццё.

***– А па-за шматлікімі абавязкамі ці атрымліваецца знайсці асабісты час для Бога?***

– Унутраная малітва са мной заўсёды. Па-за службамі і абавязковымі малітвамі заўсёды стараешся раіцца з Богам, калі нейкае рашэнне трэба прыняць, заўсёды ў думках звяртаешся да Пана Бога. Калі ўлічыць, што малітва – гэта размова чалавека з Богам, то можна сказаць, што гэта адбываецца нястомна, няспынна.

***– А адкуль Вы даведаліся пра «Няспынную малітву»?***

– Спачатку пачуў ад некаторых з нашых парафіянаў, ад моладзі. Пачуў, але яшчэ не ведаў, што і як. Больш падрабязную інфармацыю знайшоў на catholic.by. Даведаўся, што можна выбраць сабе гадзіну і маліцца ў інтэнцыі роднай зямлі.

***– Што для Вас Беларусь?***

– Беларусь – гэта мая родная зямля, мая Айчына, гэта наша культура, гэта нешта роднае, як маці, як бацька, тое, за што трэба маліцца, тое, што ў маім сэрцы. Гэта беларускія куточкі са сваім каларытам — нешта сваё ёсць і на Магілёўшчыне, і на Брэстчыне, і на Гродзеншчыне, і на Віцебшчыне. Я ўсведамляю, што гэта мая зямля, што за яе трэба маліцца, трэба прасіць Бога і аб духоўным яе адраджэнні, і культурным, і эканамічным.

***– Чаму трэба маліцца за Беларусь?***

– Нас да гэтага абавязвае запаведзь Божая. Усе мы нясём адказнасць за тую зямлю, на якой нарадзіліся і жывём.

***– Якія змены Вы заўважылі за час малітвы ў сабе і ў Беларусі?***

– Жыццё ў Беларусі патроху змяняецца: больш людзей цікавяцца і гісторыяй Беларусі, і мовай. Людзі, здаецца, адчуваюць, што павінны прыкладаць больш намаганняў, каб не страціць тое, што яшчэ засталося наша, сваё, беларускае. Адбываецца рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры, і бачна, што зацікаўленасць беларускасцю цяпер ёсць не толькі ў нейкіх закрытых групах, але і больш шырока, нават на дзяржаўным узроўні. Як хрысціянін я веру, што такая Божая «інтэрвенцыя» ў сэрцы людзей адбываецца па просьбе тых, хто моліцца.

***– Наколькі Вас хопіць у «Няспыннай малітве»?***

– Я пачаў маліцца за Беларусь даўно: маліўся яшчэ, калі толькі збіраўся ў семінарыю, таксама будучы семінарыстам, пасля служыў Імшы за Беларусь. Зараз у мяне ёсць малітоўнае правіла раніцай і ўвечары ўзгадваць у малітве Бацькаўшчыну. Гэта са мной неад'емна. А цяпер, калі ідзе «Няспынная малітва» за Беларусь, то я малюся яшчэ і з вамі, можна сказаць, больш афіцыйна.

***– Гадзіна ў малітве гэта шмат?***

– Зусім няшмат. Што такое знайсці адну гадзінку для Бога і памаліцца за Беларусь, паразважаць, пабыць з Богам, асабліва просячы духоўнага адраджэння для гэтай зямлі. Гадзіна зусім няшмат, асабліва калі казаць, што гэта гадзіна ў тыдзень.

***– Якая малітоўная патрэба зараз самая важная на Ваш погляд?***

– Духоўнасць. Мы бачым, што ў свеце адбываюцца розныя, зусім нехрысціянскія з'явы, занядбанне хрысціянскіх каштоўнасцяў. Канешне, хочацца, каб нашу Беларусь гэта неяк абмінула. Хочацца, каб наша моладзь і нашы людзі былі блізка Бога, каб стараліся захоўваць запаведзі Божыя ў сваім жыцці, асабліва запаведзі любові да Бога і бліжняга. Таксама важна маліцца за культурнае адраджэнне і за адраджэнне самасвядомасці беларусаў, каб Беларусь была годнай сярод іншых народаў.

***– Некалькі слоў для тых, хто моліцца, каб далучаліся.***

– Няхай Бог благаслаўляе. Гэта вельмі шляхетная справа – маліцца за родную зямлю. Трэба памятаць, што сам Бог наказваў нам шанаваць тое, што Ён нам даў, а таксама бараніць і захаваць для нашчадкаў. Малітва — гэта вельмі важна! Няхай усё тое, што мы робім дзеля Беларусі, будзе з Божага благаслаўлення. Толькі з Богам усё магчыма!

*Паводле Catholic.by*

# АПЛАТКАВАЯ СУСТРЭЧА МІТРАПАЛІТА ТАДЭВУША З НАВУЧЭНЦАМІ І ВЫКЛАДЧЫКАМІ МІНСКАГА ТЭАЛАГІЧНАГА КАЛЕДЖА

*17 снежня 2016 г. у касцёле Св. Сымона і Св. Алены прайшла аплаткавая сустрэча Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча з навучэнцамі і выкладчыкамі Мінскага тэалагічнага каледжа імя Св. Яна Хрысціцеля*

У межах сустрэчы адбылася святая Імша, якую ўзначаліў арцыпастыр. У гаміліі Мітрапаліт засяродзіўся на таямніцы Богаўцелаўлення.

Іерарх адзначыў, што Божае Нараджэнне ўвайшло ў гісторыю чалавецтва як «зваротныя пункт»: «Людзі, знаходзячыся ў грахоўнай цемры, убачылі святло, якое ззяе і цяпер у вечна жывым і дзейсным Божым слове, і якое з’яўляецца арыенцірам у нашым жыцці. Чалавецтва атрымала новую надзею, нават насуперак надзеі. Перад ім адкрылася новая перспектыва вечнага жыцця».

Іерарх перасцярог прысутных ад успрымання Божага Нараджэння як магічнага свята і заклікаў бачыць у ім найперш Божае пасланне, сутнасць якога ў любові Бога да чалавека, ажно да ахвяравання свайго адзінага Сына.

«Збаўленне чалавека – гэта найперш ініцыятыва Бога, знак Яго бязмежнай любові да грэшнага і нявернага чалавека, – заўважыў Мітрапаліт. – Божая любоў ахінула яго дваццаць стагоддзяў таму і працягвае ахінаць, бо Хрыстус жыве ў сваім Касцёле і прыходзіць да нас у сваім слове, сакрамэнтах, справах міласэрнасці».

Іерарх патлумачыў і сэнс наяўнасці ў Святым Пісанні радавога дрэва Езуса: «Гэты радавод нясе з сабой вельмі важнае пасланне: Хрыстус укаранёны ў гісторыі чалавецтва і з’яўляецца яго часткай. Ён прыйшоў збавіць як сваіх продкаў, так і сучаснага чалавека, і апошняга, які будзе жыць на зямлі».

«Наш абавязак – паказаць Хрыста сучаснаму свету і дапамагчы яму пазнаць Яго, каб свет мог жыць Божай праўдай», – нагадаў прысутным арцыпастыр.

«Сучасны свет патрабуе Св. Янаў Хрысціцеляў па меры выклікаў XXI стагоддзя. Патрабуе тых, хто зможа нанова паказаць свету, які тоне ў балоце секулярызму, дарогу, па якой да яго прыйдзе Хрыстус. Гэта заданне не толькі для святароў і кансэкраваных асобаў, а для ўсіх хрысціян. І вядучая роля належыць выкладчыкам і студэнтам тэалагічнага каледжа. Нездарма ён носіць імя Св. Яна Хрысціцеля.

Вы, навучэнцы каледжа, як будучыя катэхеты і бліжэйшыя памочнікі святароў у яго сценах павінны набірацца адпаведных ведаў і практыкі, каб быць галасамі, якія клічуць у сучаснай духоўнай пустыні. Вам неабходна будзе несці сучаснаму чалавеку праўду Евангелля, а праз яе – праўду Богаўцелаўлення, якая з’яўляецца сакрамэнтам Нараджэння Хрыста, каб Ён сваёю ласкай нараджаўся ў душах сучасных людзей і яны станавіліся Бэтлеемамі нашага часу», – заключыў Мітрапаліт.

Пасля эўхарыстычнай літургіі пад калядныя спевы прайшло дзяленне аплаткай.

*Фота Аркадзя Абаева*
*Паводле Catholic.by*



# «НЯХАЙ ПРАЗ ВАС СВЕЖАЕ ДУХОЎНАЕ ПАВЕТРА ЎВОЙДЗЕ Ў БЕЛАРУСЬ»

*У ноч з 17 на 18 снежня 2016 г. ў мінскай архікатэдры адбылося моладзевае чуванне. Юнакі і дзяўчаты з усёй архідыяцэзіі і не толькі з'ехаліся ў сталіцу, каб у час Адвэнту зрабіць невялікую ахвяру – адмовіўшыся ад сну, чуваць усю ноч на малітве, разважаючы таямніцу Божага Нараджэння*

Перад распачаццем святой Імшы ля святыні сустракалі скаўтаў Беларусі з Бэтлеемскім агнём. Праз хвіліну лапмада асвятляла шлях па цёмнай святыні іерархам, святарам, міністрантам і скаўтам, якія ў працэсіі накіраваліся да алтара.




Літургію ўзначаліў Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. Канцэлебравалі святую Імшу дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Юрый Касабуцкі, дапаможны біскуп Гродзенскай дыяцэзіі Юзаф Станеўскі, Апостальскі Нунцый у Беларусі арцыбіскуп Габар Пінтэр і шматлікія святары.

Арцыпастыр горача прывітаў моладзь, да якой іерарх штогод далучаецца ў ноч адвэнтавага чування.

«Падрыхтуйце дарогу Пану ў пустыні – гэтыя словы прарока Ісаі, якія паўтарыў Св. Ян Хрысціцель, з'яўляюцца лейтматывам Адвэнту – часу падрыхтоўкі да святаў Божага Нараджэння і да другога прышэсця Хрыста», – нагадаў іерарх, звяртаючыся да прысутных.

Арцыпастыр, указаўшы на актуальнасць закліку Ісаі, заахвоціў моладзь клапаціцца пра свой духоўны шлях: «Вельмі часта ён разбіты, ухабісты, няроўны, крывы, нябяспечны. Менавіта пра такі шлях нагадваюць прарок Ісая і Св. Ян Хрысціцель. Праблема ў тым, што мы прывыкаем да старых, занядбаных духоўных дарог і не заўсёды хочам іх рамантаваць, не жадаем іх мяняць».

У наш час, каб сысці на жыццёвы шлях без Бога, не трэба нават выракацца Яго. «Дастаткова быць абыякавым да Яго патрабаванняў і кіравацца тэндэнцыямі секулярнага свету», – дадаў Мітрапаліт і спытаў: «Ці здольныя мы ў такіх абставінах падрыхтаваць дарогу прыходзячаму Пану?»

«Дзякуючы сучасным сродкам масавай камунікацыі і асабліва інтэрнэту мы ведаем пра ўсё, што дзеецца ў свеце, але не маем ніякай ідэі, куды вядзе наш жыццёвы шлях, – адзначыў іерарх. – Як у такіх абставінах можна падрыхтаваць дарогу прыходзячаму Пану? Ці здольныя мы шукаць прычыны, якія разбураюць нашае духоўнае жыццё?»

Як падкрэсліў Мітрапаліт Кандрусевіч, «у час крызісу веры Адвэнт нагадвае пра тое, што мы павінны паддацца кіраванню Духа Святога – пастыра, які пазірае на нашае жыццё і кіруе ім». «Ён – гэта тая рука, якая лечыць нашы раны. Ён – гэта тая любоў, якая дае надзею», – дадаў іерарх.

У працэсе навяртання, як сцвердзіў арцыпастыр, самае складанае – гэта прызнаць праўду пра самога сябе, прызнацца ў сваёй грэшнасці.

А таму, сапраўды, варта з верай услухацца ў словы адвэнтавых прапаведнікаў – Ісаі і Яна Хрысціцеля, якія «прамаўляюць да нас гэтак жа моцна, як чынілі гэта тысячагоддзі таму сярод натоўпаў, што збіраліся вакол іх».




*Працяг на стар. 11*

# «НЯХАЙ ПРАЗ ВАС СВЕЖАЕ ДУХОЎНАЕ ПАВЕТРА ЎВОЙДЗЕ Ў БЕЛАРУСЬ»

*Заканчэнне. Пачатак на тар. 10*

«Моладзь Беларусі! Памятай, што хрысціянства не сумяшчальнае з прыстасаваннем да папулізму і секулярнай культуры. Хрысціянства – гэта рэлігія змагання за Божую праўду і барацьба супраць зла ў нас саміх і ў свеце. Нам неабходна як мага часцей праз прызму Евангелля і вучэння Касцёла шукаць сябе саміх, заглядваць у дом нашага духоўнага жыцця з мэтай адшукаць сябе там як створаных на вобраз і падабенства Божае», – звярнуўся да прысутных іерарх і заклікаў быць вернымі хрысціянскаму пакліканню.

«Няхай праз вас і вашае хрысціянскае сведчанне, як праз акно, свежае духоўнае паветра ўвойдзе ў Беларусь і дасць усім нам новую надзею, якая ў Богу», – заключыў Мітрапаліт.

Да моладзі звярнуўся і Апостальскі Нунцый арцыбіскуп Габар Пінтэр. У сваёй прамове прадстаўнік Святога Айца адзначыў, што Бога цікавіць сэрца чалавека, «бо з сэрца паходзяць усялякія добрыя або злыя ўчынкі, менавіта ў ім нараджаюцца нашыя думкі, у ім прымаюцца самыя важныя рашэнні, таму Бог жадае зрабіць яго святыняю сваёй прысутнасці, месцам спаткання з намі».

Пасля Эўхарыстыі іерархі, прысутныя святары і моладзь дзяліліся адно з адным аплаткай і складалі віншаванні з надыходзячым святам Нараджэння Пана.

Чуванне працягнулася тэматычным дакладам, адарацыяй Найсвяцейшага Сакрамэнту, ружанцовай малітвай і спевам. Адным з пунктаў сустрэчы стала інсцэніроўка, якую падрыхтавала моладзь парафіі Св. Міхала Арханёла з Івянца.

Завяршылася малітоўнае чуванне на світанні. Юнакі і дзяўчаты выходзілі са святыні са знічамі, запаленымі ад лампады з Бэтлеемскім агнём.

*Паводле Catholic.by*









# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

ФРАНЦЫСК СКАРЫНА
S.D.G et H.B.M.V.
Жыццё – вера – памяць – святасць!

*Ніякай працы і скарбаў ніякіх не шкадуйце для паспалітай карысці для Айчыны сваёй.*

*Любіце і шануйце,*
*як святыню, роднае слова,*
*з якім вас літасцівы Бог*
*на свет пусціў*

***Ф. Скарына***



## ФРАНЦЫСК СКАРЫНА – СЫН ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Яго вялікая духоўная і навуковая дзейнасць належаць не толькі многім народам Еўропы, але і ўсяго свету. Яна набірае міжнародныя, планетарныя формы, пачынаючы ад далёкіх стагоддзяў да сённяшніх дзён, і будзе існаваць вечна.

Нягледзячы на тое, што прайшло пяць стагодзяў з таго часу, як жыў і тварыў Францыск Скарына, удзячная памяць народаў з усё большаю сілаю кранае і абуджае сэрцы новых пакаленняў не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. Праца Францыска высока ацэнена і прызнана Юнэска: 1990-ы год быў абвешчаны годам Скарыны.

Сапраўды, Францыск Скарына – асоба сусветнага маштабу як навуковец і асветнік, гуманіст і першадрукар. Свет навукі і культуры ўжо дастойна ацаніў яго заслугі перад чалавецтвам: выдадзена і выдаецца многа кніг, навуковых прац, прысвечаных Скарыне. Ёсць медаль і ордэн яго імя, граматы і грамадскія ўзнагароды, помнікі, мемарыяльныя дошкі. Імем Францыска названы вуліцы, бібліятэкі, навучальныя ўстановы, рэгулярна праводзяцца канферэнцыі і чытанні аб вялікім укладзе Скарыны ў гісторыю і пісьменства Беларусі і сусветную культуру.

У Падуанскім універсітэце (Італія) ёсць «Зала Сарака». У ёй партрэты яго сусветна вядомых выпускнікоў – Галілео Галілея, Мікалая Каперніка і інш. Над партрэтам нашага суайчынніка напісана на лаціне: «Францыск Скарына з Полацка. Беларус.1512».

Здаецца, што Францыск Скарына ўжо дастойна ацэнены нашым і іншымі ўдзячнымі народамі.

Але для такой славутай асобы, як Францыск, недастаткова адной свецкай, навуковай, памяці, нягледзячы на тое, што яна перасягнула ўжо межы часу, пяцьсот гадоў жыве ў памяці пакаленняў.

Мінула атэістычная навала пераследу веры, ганьбавання ўсіх хрысціянскіх каштоўнасцей – духоўных і мастацкіх. Ваяўнічае цемрашальства знішчала не толькі духоўнае, але і ўсё нацыянальнае, простых і славутых Сыноў Беларусі.

Францыск – не толькі доктар, гуманіст, першадрукар. Ён – волат Слова Божага! Але яго заслугі перад Богам і веруючымі народамі яшчэ недастаткова ацэнены. Ён пакінуў нашчадкам «Псалтыр», 23 кнігі Бібліі, у якіх павучае і разважае. Францыск не проста перакладаў, друкаваў. Ён жыў духам Бібліі. Любіў Бога і бліжняга – свой просты люд. Таму настаў час па-сапраўднаму ацаніць не толькі інтэлектуальныя здольнасці Францыска, яго працу і цярпенні, але і зазірнуць у яго духоўны свет веры, хрысціянскага жыцця і дзеяў, якія ён цалкам прысвяціў хвале Божай, дабру паспалітага люду Бацькаўшчыны. Настала пара ўшанаваць яго і духоўна – усім Усяленскім Касцёлам і Праваслаўнай Царквою ва ўсіх хрысціянскіх святынях Беларусі і свету.

*Працяг на стар. 13*

# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

*Працяг. Пачатак на стар. 12*

Цяпер ёсць магчымасць вяртаць на Айчынную зямлю славутых, але дастаткова непрызнаваных Сыноў Беларусі. Вяртаць не толькі іх рэліквіі-парэштркі, напрацаваныя інтэлектуальныя адкрыцці, культурныя мастацкія і літаратурныя, матэрыяльныя і духоўныя шэдэўры. Усё гэта арганізацыйна зрабіць нібыта лёгка. Трэба вяртаць і іхні дух у актыўнае культурнае, інтэлектуальнае і хрысціянскае жыццё нашага пакалення, у нашу рэчаіснасць, каб мы ставілі іх узорам для сябе і ўсяго народа. У дадзеным выпадку нам могуць вельмі дапамагчы Каталіцкі Касцёл і Праваслаўная Царква.

Францыск – не толькі доктар, гуманіст, паэт, вучоны, першадрукар, і ўсё гэта дзякуючы яго вялікай хрысціянскай душы і велічы выхаванаму духу. Лічу, што такі пералік вонкавых заслуг не поўнасцю раскрывае веліч яго высакароднага ўнутранага свету і нязломнага духу веры, як волата Слова Божага, і не поўнасцю ацэньваюцца яго заслугі перад Богам і веруючым народам. Яго вобразнае параўнанне мудрасці ў прытчах **"з ядром у арэху"**, **"з золатам у зямлі"**, з сілай **"каштоўнага каменя"**. Гэта сведчыць, што ён – паэт-філосаф, які не можа не здзіўляць арыгінальнасцю і трапнасцю сваіх доказаў.

Паводле Скарыны, **трэба заўважыць дух чалавека, як ядро ў арэху**.

Ні адзін друкар не рабіў і не робіць пераклад кніжак у сваёй друкарні, не піша прадмоў і анатацый-разважанняў для чужых кніг, тым больш да Бібліі. Ні адзін друкар не дае свае каментарыі, павучэнні і праніклівыя, з жывой верай заахвочванні толькі да простага люду, не абмінаючы вучоных і заможных, як гэта робіць Францыск. Кожны друкар толькі друкуе ўсё, што яму прыносяць і за гэта атрымлівае аплату. **Тут, у адносінах да Францыска, бачна штосьці большае, чым друкар!** Францыск стаіць намнога вышэй усіх друкароў і выдаўцоў.

Францыск не даў сябе зацёрці, усыпіць у дастатку ў багатай Еўропе. Яго дух любові да Бога і ўдзячнай памяці да свайго народа пераміог. Ён не стаў на дарогу ўзбагачэння, а мог! Мог друкаваць свецкую даходную, сумніўнага зместу літаратуру, якая напэўна б яго ўзбагаціла, азалаціла, як гэта бачым сёння ў многіх выдавецтвах, якія гатовы друкаваць усё.

Для свайго вялікага пачыну – выдавецкай дзейнасці – Францыск Скарына выбраў менавіта Біблію, найбольш папулярную ў хрысціянскім свеце кнігу, у якой людзі імкнуліся знайсці адказы на самыя розныя жыццёвыя пытанні.

Францыск не толькі асабіста друкаваў кнігі Святога Пісання. Ён любіў Бога і бліжняга – свой просты, паспаліты люд.

Трэба ўбачыць і ацаніць не толькі інтэлектуальныя здольнасці Францыска, працу і цярпенні, але і смела зазірнуць у яго духоўны свет веры, хрысціянскага жыцця і дзеяў, якія ён поўнасцю прысвяціў хвале Боскай, дабру паспалітага люду Бацькаўшчыны. Ён вялікі Радзімалюб!

Трэба ўшанаваць яго і духоўна, усім нам, сваёй верай з усёй Усяленскай Царквою ва ўсіх святынях не толькі Беларусі, але і ўсяго свету, яго хрысціянскую высакароднасць.

Францыск быў вельмі таленавіты і шматгранны. Ён увабраў у сябе многія навукі і ў кожным з іх напрамкаў мог сябе бліскуча праявіць, рэалізаваць і ўзбагаціцца, як і ў той жа медыцыне, але ён абраў толькі Біблію, шлях даволі круты, цярністы.

Хто прывіў яму такую любоў да Бібліі, або Што?

Францыск знаходзіўся ў тагачасных высокіх і элітных навуковых і духоўных колах. Быў глыбока веруючым з аналітычна-лагічным мысленнем навукоўца, гэта назіраецца ва ўсім яго жыцці і працы. Дзякуючы філасофскім навукам ён пераканаўся, што Біблія з'яўляецца Кнігаю Кнігаў. Да Бога прывялі яго не толькі бацькі і духоўныя настаўнікі – ён сам прыйшоў дзякуючы навукам і свайму інтэлектуальнаму развіццю.

Што было асноваю гэтага выбару? Менавіта Біблія!

Невыказная памяць і ўдзячнасць Радзіме і свайму паспалітаму шматпакутнаму люду, пра якога ён памятаў і якому ўсімі сіламі намагаўся дапамагчы. Але як? Едзе ён на Радзіму не як лекар ці – вучоны, а як місіянер-друкар з Бібліяй, бо для тых, хто пазнае яе святы змест, яна стане лекарствам, спакоем, мудрасцю… і жыццём вечным.

"Найвышэйшая мудрасць у разважанні пра смерць, у спазнанні сябе самога і ў памятанні наступнасці".

Біблія дзецям і людзям простым – кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым – для захаплення.

Біблія – дзівосная рака! Яна бывае мелкай, і нават авечка можа яе перайсці! Але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці праз яе! У гэтай кнізе – пачатак і канец усёй існуючай мудрасці, бо толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-Ўладара! У гэтай кнізе – усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! У гэтай кнізе – усе лякарствы душэўныя і цялесныя разам знойдзеце!

*Працяг на стар. 14*

# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

*Працяг. Пачатак на стар. 12–13*

Тут – навучанне філасофіі добрапрыстойнае: як Бога любіць для самога сябе і для бліжняга свайго! Тут – справа ўсялякага збору люду і горада, якія праз веру, ласку і згоду паспалітую дабро памнажаюць. Тут – поўнае навучанне сямі навукам вызваленым!

З вышэй сказанага робім выснову, што, маючы вялікую веру і любоў да Бога і Маці Божай, Францыск загарэўся і вялікай любоўю да свайго люду. А як найлепей дапамагчы яму, калі не друкам Бібліі, не пашыраць веру і веды ў сваім народзе. Вось, ШТО было яго святым рухавіком.

**Я адчуваю сваім святарскім перакананнем, што Францыск – гэта Божы голас, звернуты праз стагоддзі да нашага пакалення, нашай сучаснасці!** Францыск прысвячаў гэтаму здароўе, маёмасць – усё сваё жыццё. Адрокся ад славы і багацця ў свеце. Як законнік і пустэльнік закрыўся ў сваім пакоі-кабінеце і друкарні, нягледзячы на тое, што жыў у цэнтры дзяржаўных сталіц – Прагі і Вільні, перапоўненых людзьмі і жыццёвымі радасцямі.

Меў ён выпрацаваную вялікую сілу волі. Вось дзе яго ахвярны славянскі дух!

Вера Францыска прайшла залатой ніццю праз усё яго жыццё.

Ён, як рэдка хто, дзень і ноч разважаў і працаваў над тэкстам Бібліі. Ён палюбіў Біблію – Слова Божае, захапіўся ім і палымнеў душою, каб перадаць гэты агонь Божай любові свайму любаму "паспалітаму люду". Толькі той мог запаліць, хто сам гарэў.

"Так няхай свеціць святло ваша перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі і ўслаўлялі Айца вашага, Які ёсць у нябёсах" – (*Мф 5, 16*).

**Ён жыў Бібліяй**. Ён прапускаў праз сваё сэрца кожны біблейскі сказ, што бачна ў яго каментарах. Не быў абыякавы да напісанага тэксту. У духу бачыў Біблію на сталах і алтарыках у кожным доме Беларусі, дзе сабраныя ў кола бацькі і дзеці чыталі Слова Божае. Вось што было вялікім рухавіком для Францыска: духоўная і інтэлектуальная адукацыя народа.

«Псалом ест щит против бесовскым нощьным мечтаниям и страхом, покой денным суетам и роботам, защититель младых и радость старым, потеха и песня, женам набожьныя молитва и покраса, детем малым початок всякое доброе наукы, дорослым помножение в науце, мужем модное утверьжение».

Францыск – узор любові да роднай мовы і народа ў духу жывой веры і ўзорнага, цнатлівага хрысціянскага жыцця.

У друкаванай кнізе Скарына бачыў невычэрпныя магчымасці духоўнай асветы народа, выхавання высокіх хрысціянскіх, маральных і грамадзянскіх якасцей, усё мацнейшага далучэння і актыўнага ўзаемадзеяння з еўрапейскім культурна-гістарычным соцыумам.

Францыск сваёй філіграннай працаю намагаўся наблізіць свой народ, нашу Айчыну да Еўрапейскага ўзроўню жыцця.

Францыск поўнасцю і літаральна намагаўся наследаваць Збавіцеля Ісуса Хрыста, Які маліўся:

"Слаўлю Цябе, Ойча, Гасподзь неба і зямлі, што Ты ўтоіў гэта ад мудрых і разумных і адкрыў для малых" (*Мф 11, 25*).

Ён услед за Евангелістам Мацвеем лічыў: просты чалавек можа ўбачыць у Святым Пісьме тое, што нярэдка застаецца неўспрынятым высокаадукаванымі людзьмі.

Добра разумеючы ролю кнігі ў грамадстве, Скарына бачыў у ёй адзін з найважнейшых сродкаў культурнага прагрэсу і нацыянальнага Адраджэння. Яго кнігі на роднай мове сталі той паходняй, якая ўказвала людзям сапраўдны шлях у будучае, тым знічам, які саграваў і асвятляў людское жыццё ў непагадзь і завею. Разам з тым яны адлюстроўвалі і асабістыя рысы выдаўца, яго духоўную адоранасць і непаўторнасць, веліч яго подзвігу.

Францыск – вялікі ўмілавальнік Слова Божага, і, не пабаюся сказаць, стаў на ўзроўні Святога Гераніма, які пераклаў Біблію на лацінскую мову.

Францыск – місіянер і катэхізатар Слова Божага для нашых народаў, як Святыя Кірыл і Мяфодзій для Еўропы.

Кнігі Скарыны аказалі вялікі ўплыў на развіццё духоўнай культуры Беларусі і Украіны, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай Русі, распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях.

*Богу въ Троици единому ко чти и ко славе,*
*Матери его Пречистой Марии к похвале.*
*Всем небесным силам и святым его к веселію,*
*Людем посполитым к доброму научению.*

Паэтычныя радкі нараджалі ўзнёслае ўспрыманне ўсёй кнігі, абуджалі эмоцыі і глыбокія пачуцці ў чытача, рыхтавалі яго да сустрэчы з незвычайным, таямнічым, прыгожым.

Усе пераклады кніг Бібліі Ф. Скарына адрасаваўў «людем посполнтым к доброму наученню», Ён хацеў пашырыць духоўную асвету сярод суайчыннікаў, дапамагчы простым людзям пазнаць мудрасць і навуку Божую. 3 гэтай мэтай кожную з кніг Ф. Скарына суправаджаў прадмовамі і пасляслоўямі.

*Працяг на стар. 15*

# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

*Працяг. Пачатак на стар. 12–14*

У іх першадрукар выказваў свае грамадскія і асветніцкія погляды, заклікаў да ўмацавання правапарадку, да стварэння справядлівых заканадаўчых кодэксаў, прысвечаныхдзяржаве, войску, зямлі, тлумачыў незразумелыя словы і звароты, а таксама розныя звесткі па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, філасофіі, астраноміі.

У «Малой падарожнай кніжыцы» Скарына змясціў розныя каляндарныя і астранамічныя звесткі (беларускія назвы месяцаў, знакаў задыяка) – усё тое, што неабходна было чалавеку ў дарозе.

«Псалтыр» (*зборнік са 150 Псалмаў, па якіх у сярэднявеччы вучыліся грамаце*) Скарына адрасаваў «дзецям малым як пачатак усякай добрай навукі», а таксама дарослым настольную кнігу, душавыратавальнае чытанне. Псалмы «Псалтыра», лічыць Скарына, – «гэта скарб, безліч каштоўных каменняў! Яны розную немач духоўную і цялесную выганяюць! Душу і розум прасвятляюць і гнеў і лютасць уціхамірваюць! Мір і спакой чыняць! Смутак і скруху адганяюць! Пачуцці ў малітвах даюць! Людзей зычлівымі робяць! Ласку і міласць мацуюць! Д'ябла праганяюць, анёлаў на дапамогу заклікаюць!»

Францыск – узор для ўсіх майстроў узвышанага слова навукі, паэзіі і прозы. Дык няхай жа кожны сумленны майстар слова, навуковец дае свой глыбокі каментар пра напісанае і сказанае.

Асветнік Скарына садзейнічаў пашырэнню пісьменства, ведаў. Пра гэта сведчыць яго заклік да чытання Біблії:

"Кніга (Біблія) – люстэрка людскога жыцця і душэўныя лекі, уцеха – самотным, зняверанымпомач, і асабліва тым, каго немач точыць і верад рушыць". "У Біблії пачатак і канец усёй існай мудрасці! Толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-Уладара! У гэтай кнізе – усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! У гэтай кнізе ўсе лекі душэўныя і цялесныя разам знойдзеце!"

Прото ж добре Григорий Великий, учитель Вселенский-(Папа), о сей книге пишет, глаголя: «Святое Писмо все иные науки превышает, понеже егда бывает чтено, под простыми словами замыкает тайну».

Гуманіст Скарына пакінуў свой маральны запавет у наступных радках, якія ўтрымліваюць мудрасць чалавечага жыцця і ўзаемаадносін паміж людзьмі. Пераказваючы сюжэты біблейскіх кніг, Скарына ў прадмовах акцэнтуе ўвагу чытача на самых важных момантах Біблії – на законах вечнасці: «Закон прироженый в том наболей соблюдаем бываеть: то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и тог о не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети... Сей закон прироженый написан ест в серци единого кажного человека»; «...Наболей любовь ко всем да соблюдает, ежели ест совершенна над все иные дарования, без нея же ничто поспешно ест».

Прадмовы і пасляслоўі Францыска Скарыны да Біблії, дзе ён раскрывае глыбокі сэнс біблейскіх сказанняў, прасякнуты клопатам аб разумным упарадкаванні грамадства, выхаванні чалавека, усталяванні дастойнага жыцця на зямлі.

Францыск, напэўна, марыў вярнуцца на Бацькаўшчыну і такім была, напэўна, яго апошняя воля. Ён хацеў вярнуцца з назапашаным, назбіраным інтэлектуальным і духоўным багажом, каб тут разгарнуць сапраўдную выдавецкую дзейнасць на хвалу Божую і дабро людзям.

Францыск Скарына – пачынальнік новага разумення патрыятызму любові і павагі да сваёй Айчыны і люду. З патрыятычных пазіцый, прасякнутых жывой і глыбокай верай, успрымаюцца наступныя яго словы, якія Францыск Скарына скіраваў з любоўю да сваёй невялікай радзімы: «*Понеже от прирождения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя, птици, летающие по воздуху, ведають гнёзда своя; рибы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчёлы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, и где зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають*».

Адсюль ідзе і палкае жаданне Скарыны служыць свайму народу, распаўсюджваць хрысціянскія і рэнесансна-гуманістычныя погляды, натхняць на праявы асабістай і грамадскай актыўнасці, дасканаласці, спасціжэнне высокіх сэнсаў зямнога быцця і Боскіх Запаветаў.

З Еўропы Францыск некалькі разоў намагаўся вярнуцца ў Вільню, бо толькі там магла быць матэрыяльная падтрымка ад мецэнатаў і аднадумцаў у друкаванні Біблії, чаго ён не знаходзіў у родным Полацку.

У 1520 годзе ён пераязджае ў Вільню – сталіцу Вялікага Княства Літоўскага, дзе **засноўвае першую на тэрыторыі гэтай дзяржавы друкарню**, каб разгарнуць нанова выдавецкую дзейнасць **для ўсёй славянскай прасторы**. У 1522 годзе выдае «Малую падарожную кніжыцу», а ў 1525 годзе «Апостал».

У 1534 годзе Францыск Скарына з надрукаванымі кнігамі і з вялікай надзеяй распачаў падарожжа ў Вялікае Княства Маскоўскае, дзе паспрабаваў зацікавіць сваімі выданнямі маскоўскае грамадства, але тады яго ніхто не падтрымаў.

*Працяг на стар. 16*

# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

*Працяг. Пачатак на стар. 12–15*

Яго выгналі, бо ён быў каталіком, а кнігі Бібліі ў Маскве былі публічна спалены як ерэтычныя.

Хрыстос настаўляе Вучняў: "Ісус жа адказаў: не забараняйце яму, бо той, хто робіць цуды імем Маім, не зможа пасля казаць благое пра Мяне" (*Мк 9, 39*).

Можна адчуць боль і скрушны дух Францыска падчас вяртання з Масквы ў Вільню. Падобны лёс мог чакаць яго і ў родным Полацку, у якім тады быў толькі праездам. Напэўна, яго сэрца разрывалася, адчуваючы родныя мясціны. Адкінуты і незразуметы сваімі суайчыннікамі, ён не пакідаў сваё святое заданне далей працаваць над Бібліяй, яе выданнем і не пераставаў любіць Радзіму, свой народ. Пакора перамагла, памагла знесці ўсе крыўды.

У віленскага Біскупа Яна Скарына служыў сакратаром і лекарам да 1535 года. Праз год Біскуп Ян пакінуў Віленскае біскупства, быў пераведзены ў Познань, дзе неўзабаве памёр. Спалучэнне розных абставін і адсутнасць выразнай сацыяльнай падтрымкі вымусілі Францыска Скарыну пакінуць ВКЛ, пакінуць Радзіму і ад'ехаць назад у Прагу. Ён вяртаецца зноў у Еўропу, дзе яго прымаюць, але там ён заўсёды адчуваў сябе чужынцам. З такім пачуццём дажывае апошнія дні свайго жыцця. Толькі жывая вера і карпатлівая праца над Бібліяй дапамагаюць яму – волату Божага Слова перамагчы адзіноту.

Магістр Тэўтонскага ордэна Альбрэхт Брандэнбургскі запрасіў Францыска ў Кёнігсберг (*Калінінград*). Пісаў сам герцаг: "*Не так даўно прынялі мы ў наша валоданне і Прускае княства слаўнага мужа Францыска Скарыну з Полацку, доктара медыцыны, надзвычай шаноўнага з вашых грамадзян як нашага падданага, двараніна і любімага намі вернага слугу*".

У выданнях Скарыны паўтараецца выява сонца і месяца з чалавечымі аблічча. Выбар сімвалу яўна невыпадковы. Гэты знак быў створаны і абраны Скарынам «у якасці свайго асабовага герба». У выяве – сонца з праменнямі, месяц і кніга-Біблія, як крыніца мудрасці, ведаў і асветы – сімвал перамогі святла над цемрай, жыцця над смерцю.

Знак Скарыны трактуецца як хвала і слава кнізе Бібліі – крыніцы святла, мудрасці, дабрачыннасці і ведаў.

У вершы «Скарына пакідае Радзіму» Уладзімір Караткевіч сцвярджаў думку аб недаравальнай віне суайчыннікаў перад такім тытанам, які вымушаны быў цярпець нягоды, нястачы, шукаць прытулку на чужыне; ствараючы ўзвышанае.

**Упершыню ў гісторыі ўсходнеславянскага друкавання асветнік выкарыстаў тытульны ліст, тлумачальныя падзагалоўкі, пааркушавую нумарацыю, абзацы, г. зн. прыдаў кнізе сучасны выгляд.**

Вось чаму яго кнігі шырока распаўсюдзілі па Еўропе, аказалі вялізны ўплыў на чытачоў у многіх краінах свету. Вынаходніцтва першай друкаванай кнігі стала падобным да вынаходніцтва першага кола ці пазней тэлефона…

Пры перакладзе «Бібліі» Скарына абапіраўся на глыбокі філалагічны аналіз папярэдніх выданняў, выкарыстоўваў старадрукі. Рыхтуючы да друку тэксты Святога Пісання, асветнік грунтоўна займаўся іх глыбокай тэксталагічнай апрацоўкай, экзегетыкай і герменеўтыкай.

Багаты духоўны інтэлект Скарыны ставіць яго ўпоравень з выдатнейшымі людзьмі эпохі Рэнесансу.

Скарына выступіў гарачым прыхільнікам духоўнага і грамадскага адзінства ўсяго народа. **Упершыню ў гісторыі Беларусі былі так цесна спалучаны ідэі адзінства хрысціянскай і этнічнай свядомасці.**

Будучы верным Богу і з Божай дапамогаю, Францыск вытрываў да канца і перамог. **Бог яму дапамог!**

Ён дачакаўся часу, што пра яго на Бацькаўшчыне не толькі ўспомнілі. Ён мог смела вярнуцца да яе, як СЫН, як муж вялікай славы і гонар для ўсёй Беларусі.

Поўнасцю падтрымліваю і лічу своечасовым зварот навукоўцаў і інтэлігенцыі да Мітрапалітаў Тадэвуша і Паўла, як і да Нунцыя Апостальскай Сталіцы, каб Усяленскі Касцёл на чале з Папам Францыскам разгледзеў заслугі Скарыны, чысціню яго веры, гераічнасць жыцця і вернасць Хрыстовай Усяленскай Царкве.

Адначасова, на маю думку, у дачыненні да Францыска мы маем яшчэ многа незавершанай працы. Цяпер бачу нашы наступныя святыя абавязкі:

1. Знайсці ў Чэхіі і ўшанаваць месца пахавання Францыска Скарыны;

2. Зрабіць паўторны зварот да шаноўных Мітрапалітаў Каталіцкай і Праваслаўнай Цэркваў у Беларусі Архібіскупа Тадэвуша і Паўла, як і скласці просьбу на рукі Нунцыя Апостальскай Сталіцы з хадайніцтвам аб распачацці інфармацыйнага працэсу і вылучэнні Францыска Скарыны да годнасці Слугі Божага і, калі будзе на тое Божая воля, да ліку Бласлаўлёнага і Святога. Для гэтага трэба сабраць подпісы з усёй Беларусі як сведчанне духоўнай удзячнасці Усявышняму за славутага Сына Беларусі.

3. Завяршэннем усяго было б тое, каб Францыск

*Праца на стар. 17*

# БОГ – БІБЛІЯ – БАЦЬКАЎШЧЫНА!

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 12–16*

Скарына ўсіх нас аб'яднаў ва ўзаемнай хрысціянскай любові, бо такім быў сэнс усяго яго жыцця:

**Бог – Біблія – Бацькаўшчына!**

Францыск Скарына павінен быць прыняты ўсёй нашай краінай і яе жыхарамі розных веравызнанняў, як узор годны да наследавання.

«Напісанае застаецца», – гаварылі старажытныя рымляне.

Францыск Скарына пакінуў нашчадкам кнігі, у якіх засталіся самыя патаемныя, выпакутаваныя яго думкі.

Гэтыя кнігі Вялікага беларуса ўспрымаюцца сёння як самая дарагая нацыянальная рэліквія, як духоўны скарб, нацыянальная святыня, як сімвал усёй тысячагадовай беларускай культуры.

Цяпер настаў час адраджэння сумлення, удзячнасці і прызнання нашым пакаленнем духоўных якасцей-цнотаў Францыска Скарыны. Трэба і нам спасцігаць асновы духоўнасці і веры, вучыцца ўглядацца ў духоўнысвет чалавека, а не толькі бачыць і славіць вынік самой дзейнасці чалавека.

Убачыць ядро ў арэху, як зрабіў Наш Брат Францыск Скарына!

*Ксёндз-магістр*
*Уладыслаў Завальнюк*



# САКРАМЭНТ КАНФІРМАЦЫІ

*Першая Нядзеля Адвэнту ў нашым касцёле адзначылася надзвычайнай падзеяй: 52 вернікі прынялі Сакрамэнт Канфірмацыі з рук Яго Эксцэленцыі біскупа Юрыя Касабуцкага*







Да гэтага моманту кандыдаты рыхтаваліся цэлы год: паглыблялі свае рэлігійныя веды, вучыліся трываласці і сталасці, якіх патрабуе гэты Сакрамэнт. У малітве ўслухоўваліся ў Божы голас, каб зразумець, чаго сапраўды чакае ад сваіх паслядоўнікаў Езус. Памяталі, што “Ён нашых рук патрабуе, кропель поту і шчырага сэрца”, таму адмысловым чынам паклапаціліся аб аздабленні храма. І, вядома, прыйшлі ў нядзелю да святочнага алтара з чыстымі сэрцамі, каб Дух Святы знайшоў сабе сапраўдны дом у нашых душах.

Былі і слёзы расчуленасці, і святочныя віншаванні, і ўзнёслыя гукі “Гімна да Духа Святога”. І сёння ў нашых сэрцах жыве адчуванне свята і бязмернай удзячнасці Богу за 106 год існавання нашай святыні.

Жадаем усім, хто падзяліў з намі радасць гэтага дня, каб Дух Святы напаўняў кожнае сэрца.

*Марыя Новікава,*
*фота кс. Аўгуста Калясінскага*



# ЛІТАРАТУРНАЯ ВЕЧАРЫНА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

*У нядзелю, 13 лістапада 2016 г., ў бібліятэцы імя Адама Міцкевіча, што ў Чырвоным касцёле, адбылася літаратурная вечарына з нагоды 70-годдзя беларуская пісьменніка Генрыха Далідовіча*



Немагчыма перадаць тую святочную атмасферу, якая панавала ў бібліятэцы імя Адама Міцкевіча Чырвонага касцёла 13 лістапада. Тут а 16-й гадзіне на літаратурную вечарыну сабраліся чытачы, сябры, калегі, каб ушанававаць вядомага сучаснага беларускага пісьменніка Генрыха Далідовіча з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння. З першай хвіліны вечарыны ў зале адчуваўся ўзнёслы настрой, гучалі віншаванні і прывітальныя словы ў адрас юбіляра, пажаданні добрага здароўя і творчых поспехаў у літаратурнай працы. Гучалі ўрыўкі з твораў аўтара, а таксама вершы іншых удзельнікаў вечарыны ў гонар юбіляра. Сам Генрых Вацлававіч распавёў пра гісторыю напісання некаторых сваіх раманаў, радавод Далідовічаў, сям'ю, сваіх жыццёвых і літаратурных настаўнікаў і сяброў. Падзяліўся і планамі на будучае, у прыватнасці тым, што мае запаветную задумку напісаць вялікі гістарычны твор пра Грунвальдскую бітву.



На вечарыне выступілі сябры і калегі па цэху, якія ведаюць Генрыха Далідовіча не адзін дзясятак гадоў. Былі сказаны выдатныя словы, што Генрых Вацлававіч – эталон еўрапейскага празаіка. Гэта арганічны чалавек у сваім стаўленні да жыцця, прыроды, людзей, старэйшага пакалення. Успаміналі таксама і літаратураных настаўнікаў, іх ролю ў фарміраванні Генрыха Далідовіча як пісьменніка. Генрых Вацлававіч прайшоў шлях ад зямлянкі, у якой ён нарадзіўся ў першы пасляваенны год, да беларускіх нябёсаў, да вышыні чалавечага духу і нацыянальнай самасвядомасці. Генрых Вацлававіч з'яўляецца добрым сем'янінам, мае дваіх дзяцей і двух унукаў. Пра гэта гаварылі Барыс Сачанка, Алесь Пашкевіч, Кастусь Травень. А як цікава расказвала Валерыя Іванаўна Навуменка, дачка класіка сучаснай беларускай літаратуры Івана Навуменкі, пра жыццё ў пісьменніцкім доме па вуліцы Карла Маркса, 36, або пра жыццё на лецішчах на знакамітай Лысай гары; пра дарэвалюцыйны Мінск і Чырвоны касцёл, куды хадзіла яе бабуля-каталічка, калі была маладой дзяўчынай.

Проза Генрыха Далідовіча – гэта падзеі ў жыцці краіны і асобна ўзятага чалавека ў духу эпохі. Таму яго творы цікавыя і запатрабаваныя сёння як у беларускамоўнага, так і рускамоўнага чытача. Генрых Далідовіч – аўтар шматлікіх апавяданняў, аповесцей, раманаў. За раман "Гаспадар-камень" пісьменнік атрымаў літаратурную прэмію імя Івана Мележа (1986), за раман "Заходнікі" – Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь (1996). Трэба адзначыць, што вядомасць пісьменнік набыў менавіта як раманіст. І адна з самых распрацаваных тэм – гістарычная. Вяртанне ў даўніну – яшчэ адна магчымасць зразумець, адкуль мы і хто мы ("Кліч роднага звону", "Гаспадар-камень", "Пабуджаныя", "Свой дом", "БНР-БССР"). "Свой дом" – трэцяя частка раманаў пра ўтварэнне БНР і БССР. Услед за Мікалаем Ермаловічам, Нілам Гілевічам пісьменнік у гэтых кнігах разважаў над паняццем "свой дом", а потым гэта паклікала яго ўзяцца за больш даўнюю гісторыю. Ён пазнаёміўся з летапісамі, хронікамі, даследаваннямі. Наш дом, наша дзяржаўнасць закладалася яшчэ ў Полацку, калі ствараліся, мацаваліся асновы нашай пляменнасці, роднасці, войска, казны. Полацкае княства стала асновай нашай дзяржаўнасці.

*Працяг на стар. 20*

# ЛІТАРАТУРНАЯ ВЕЧАРЫНА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 19*

Іменна Мікалай Ермаловіч натхніў Генрыха Далідовіча напісаць раман “Кліч роднага звону” пра ўтварэнне ў далёкім XIII стагоддзі Вялікага княства Літоўскага з цэнтрам у сённяшнім Навагрудку, падказаў нацыянальную канцэпцыю афармлення гэтай дзяржавы, што стала адной з буйнейшых у Еўропе.

Другая важкая тэма – жыццё беларускай вёскі. Раман “Заходнікі” напісаны на аўтабіяграфічным матэрыяле роднай вёскі Янкавічы, што ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. Родныя мясціны не адпускаюць яго, і ён з’яўляецца іх мастацкім летапісцам.

Літаратурную дзейнасць пісьменнік пачынаў з малых форм – апавяданняў – ( “Ліст да Олі” 1966 г.), але не развітаўся з гэтым жанрам і праз 30 гадоў. У выніку нарадзілася кніга “Жар кахання” (1996). З’яўленне гэтай кнігі своечасовае і вельмі патрэбнае сёння, калі сустракаецца нямала выданняў, што прапагандуюць распусту і ўсёдазволеннасць.

А затым вечарына прадоўжылася за сталом з гарбатай і кавай, дзе ўсе прысутныя актыўна вялі размовы на літаратурныя тэмы, чыталі вершы, задавалі пытанні і слухалі адказы любімага пісьменніка. Напрыканцы сустрэчы аўтар падараваў бібліятэцы імя Адама Міцкевіча некалькі сваіх кніг з памятным надпісам.

Пажадаем жа Генрыху Далідовічу добрага здароўя, творчых поспехаў у літаратурнай дзейнасці і чакаем прэзентацыі яго новых кніг.

*Ванда Іваноўсая,*
*бібліятэкар бібліятэкі імя Адама Міцкевіча*





# ВЫКЛЮЧНАЯ ХАРЫЗМА І ДУШПАСТЫР СВЕТУ: ПАПУ ФРАНЦІШКУ СПАЎНУЛАСЯ 80 ГАДОЎ

*Нават беглы погляд на апошнія пантыфікаты можа стаць для нас урокам веры. Баланс кіравання Касцёлам рознымі Папамі, безумоўна, розны, але адначасова ўражвае настолькі, што нельга не ўбачыць дзейнасць Божага Провіду у іх выбары на месца Пантыфіка*



**Выключная харызма**

Што можна сказаць пра папу Францішка? Яго пантыфікат, нягледзячы на адчуванне прошлага часу, толькі распачаўся. Якім чынам асоба аргенцінскага Папы ўзбагаціла Паўсюдны Касцёл? Што ўнесла ў яго вобраз, у які бок змясціліся акцэнты?

Выбар Хорхе Марыа Берголіа Папам Рымскім быў для свету нечаканасцю. Цалкам па-іншаму ўсё выглядала для кардыналаў. У інтэрв'ю Петэра Зээвальда з Бэнэдыктам XVI у кнізе «Апошнія размовы» на гэтую тэму ёсць цікавы ўрывак. Нямецкі журналіст задае Папу-эмерыту пытанне пра канклаў, падчас якога кардынал Ратцынгер быў выбраны новым наступнікам св. Пятра. Бэнэдыкт XVI не пракаментаваў пытанне, але даў зразумець, што відавочна ўжо тады арцыбіскуп з Буэнас-Айрэса меў папулярнасць сярод кардыналаў.

Гэта безумоўна можа сведчыць пра яго выключную харызму. Яго, біскупа-езуіта, не ведалі ў Еўропе, але вернікі яго архідыяцэзіі, як і біскупы з Лацінскай Амерыкі, сведчылі, што яшчэ перад выбарам Папам Рымскім яго вельмі шанавалі, з вялікай павагай і пашанай ставіліся да яго і палітычныя дзеячы.

**Стварыў «дыяцэзію для бежанцаў»**

Не так проста пісаць на тэму чалавека, якім з'яўляецца папа Францішак. З часам ў свет выйдзе шмат кніг на гэты конт і будуць напісаныя амбіцыйныя дысертацыі. Іх аўтары будуць класіфікаваць навучанне Пантыфіка, ставячы сабе за мэту дасканалы аналіз яго дакументаў, прамоў і гамілій...

Але што заслугоўвае нашай увагі ўжо сёння? Ці можам сказаць пра Папу Рымскага штосьці, што запомніцца свету?

Без сумненняў ў чарговы раз трэба прызнаць выбар папы Францішка Пантыфікам дзейнасцю Божага Провіду. Гэта не магло быць проста супадзеннем, што наплыў бежанцаў прыйдзецца на пантыфікат гэтага Папы. Святы Айцец у сваёй краіне сутыкаўся з людскімі бедамі ў трушчобах, а сам – як еўрапеец па паходжанні – дасканала разумее, што стаіць за няпростым лёсам імігрантаў.

Папа просіць парыкмахераў рабіць бясплатныя стрыжкі для бежанцаў, Папа кажа пра неабходнасць стварэння асобнай дыяцэзіі для іх. І ў гэтым праяўляецца яшчэ больш асоба Папы. У гэтым вобразе – Папы, які раздае міласціну, – мігранты бачаць не толькі душпастыра, але і біскупа.

Дзякуючы сваёй заангажаванасці папа Францішак становіцца сёння сумленнем еўрапейцаў, натхненнем для палітыкаў і грамадскіх дзеячаў. Папа становіцца галоўным лекарам душаў у Касцёле, які ўяўляе сабой палявы шпіталь.

**Душпастыр свету**

У асобе Яна Паўла II Касцёл атрымаў абаронцу людской годнасці, у асобе Бэнэдыкта XVI – асілка каталіцкай веры, у асобе папы Францішка Касцёл атрымаў душпастыра свету. Так ужо казалі пра папу Яна XXIII, але сённяшні Пантыфік з'яўляецца пробашчам глабальнага маштабу. Няцяжка зразумець, што ў СМІ Пантыфік мае вялікую папулярнасць. Любоў журналістаў да Папы заключана ў яго простасці. Нават калі б не з'явіліся важныя энцыклікі ці адгартацыі, увесь свет быў бы ўдзячны папу Францішку за яго твіты, простыя казанні з Дому св. Марты, а таксама за глыбокія пастырскія навучанні.

Напэўна, увесь свет запомніць святара ў белай сутане, які сядае ў самалёт з чорным партфелем у руцэ. Калі яго аднойчы спыталі падчас прэс-канферэнцыі, чаму ён не скарыстаўся дапамогай адказных службаў і сам нёс такі цяжар, Пантыфік адказаў, што трэба захоўваць нармалёвасць. Бо падчас падарожжа кожная духоўная асоба хоча мець пры сабе брэвіярый...

Папа Францішак, з нагоды Твайго дня нараджэння жадаем, каб ты заставаўся сабой. Будзем здзіўляцца Тваёй нармалёвасцю, якая не з'яўляецца нормай сярод дзяржаўных дзеячаў. Іншымі словамі, гэта нармалёвасць з'яўляецца зусім ненармальнай, але за яе мы і любім папу Францішка.

*Паводле Catholic.by*

# МАРЫЯ І ЮЗАФ – АСОБЫ, ЯКІЯ НАЙБОЛЬШ ДАКРАНУЛІСЯ ДА ТАЯМНІЦЫ БОЖАЙ ЛЮБОВІ

«Літургія чацвёртай і апошняй нядзелі Адвэнту прасякнута тэмай блізкасці: блізкасці Бога да чалавецтва. Урывак з Евангелля (пар. Мц 1, 18–24) паказвае нам дзвюх асобаў; дзвюх асобаў, якія больш за ўсіх іншых людзей мелі дачыненне з гэтай таямніцай любові: Панну Марыю і Яе абранніка святога Юзафа. Таямніца любові, таямніца блізкасці Бога да чалавецтва.

Марыя паказаная ў святле прароцтва, якое кажа: «Вось Дзева зачне і народзіць Сына» (Мц 1, 23). Евангеліст Мацвей сцвярджае, што гэта здзейснілася ў Марыі, якая зачала Езуса моцаю Святога Духа (пар. Мц 1, 18). Сын Божы «ўваходзіць» у Яе ўлонне, каб стацца чалавекам, і Яна Яго прымае. Такім унікальным чынам Бог наблізіўся да чалавечай істоты, прымаючы цела ад звычайнай жанчыны: Бог наблізіўся да нас і прыняў цела ад жанчыны. Таксама да нас, хоць і па-іншаму, Бог набліжаецца са сваёю ласкаю, каб увайсці ў нашае жыццё і каб даць нам у дар свайго Сына. А што робім мы? Мы Яго прымаем, дазваляем Яму наблізіцца, або наадварот, адкідаем Яго, гонім Яго прэч? Як Марыя, дабравольна аддаючы сябе ў распараджэнне Пану гісторыі, дазволіла Яму змяніць лёсы чалавецтва, таксама і мы, прымаючы Хрыста і імкнучыся кожны дзень ісці за Ім, можам супрацоўнічаць у здзяйсненні Ягонага плану збаўлення нас саміх і ўсяго свету. Таму Марыя паўстае перад намі як узор, на які належыць глядзець, і як падтрымка, на якую варта разлічваць у нашым пошуку Бога, у нашай блізкасці з Богам, каб дазволіць Богу наблізіцца да нас у нашых намаганнях дзеля пабудовы цывілізацыі любові.

Другі галоўны герой сённяшняга Евангелля гэта святы Юзаф. Евангеліст апісвае, як Юзаф не ў стане сам сабе растлумачыць з’явы, якая адбываецца на ягоных вачах, а менавіта цяжарнасці Марыі. Менавіта цяпер, у гэты момант сумнення, нават занепакоенасці, Бог становіцца з ім побач – таксама з ім – праз свайго пасланца, што пралівае яму святло на сутнасць гэтага мацярынства: «Зачатае ў Ёй ёсць ад Духа Святога» (Мц 1, 20). Такім чынам, сутыкнуўшыся з надзвычайнай падзеяй, якая, зразумела, нарадзіла ў ягоным сэрцы шмат пытанняў, ён цалкам давяраецца Богу, які да яго набліжаецца, і, прыняўшы Яго прапанову, не аддаляе сваю Нарачоную, але прымае Яе да сябе і бярэ Марыю замуж. Прымаючы Марыю, Юзаф свядома і з любоўю прымае таго, хто ў Ёй быў зачаты цудоўнаю моцаю Бога, для якога няма нічога немагчымага. Юзаф, чалавек пакорны і справядлівы (пар. Мц 1, 19), вучыць нас заўсёды давяраць Богу, які набліжаецца да нас: калі Бог набліжаецца, мы павінны даверыцца Яму. Юзаф вучыць нас дазволіць Яму павесці нас за сабою і дабравольна падпарадкавацца.

Дзве гэтыя асобы, Марыя і Юзаф, якія першымі прынялі Езуса праз веру, уводзяць нас у таямніцу Божага Нараджэння. Марыя дапамагае нам падрыхтаваць сябе да таго, каб быць гатовымі прыняць Божага Сына ў нашым канкрэтным жыцці, у нашым целе. Юзаф заахвочвае нас заўсёды шукаць Божай волі і ісці за ёй з поўным даверам. Яны абодва дазволілі Богу наблізіцца да сябе.

«Вось Дзева зачне і народзіць Сына, і дадуць Яму імя Эммануэль, што азначае „з намі Бог“» (Мц 1, 23). Так кажа Анёл: «Дзіцятка будзе названае Эммануэль, што азначае „з намі Бог“», што Бог побач з намі. Ці я адчыняю дзверы Богу, які набліжаецца, Пану, калі адчуваю ўнутранае натхненне, калі чую, што Ён просіць мяне зрабіць штосьці большае для іншых людзей, калі заклікае мяне да малітвы? Бог з намі, Бог, які побач. Няхай гэтая вестка надзеі, якая здзяйсняецца на Божае Нараджэнне, зробіць плённым чаканне Бога таксама ў кожным з нас, ва ўсім Касцёле і ў шматлікіх маленькіх людзях, якімі свет пагарджае, але якіх любіць Бог і да якіх Бог набліжаецца.

Пасля малітвы «Анёл Панскі»: Дарагія браты і сёстры, я вітаю вас усіх, вернікаў Рыма і пілігрымаў, якія прыбылі з розных краінаў, сем’і, парафіяльныя групы, рухі. Прашу ўсіх вас маліцца за тое, каб дыялог у Дэмакратычнай рэспубліцы Конга працягваўся ў духу паразумення, каб пазбегчы любога насілля і дзеля дабра ўсёй гэтай краіны.

Асаблівым чынам вітаю шматлікую групу прадстаўнікоў Італьянскага нацыянальнага саюзу дастаўкі хворых у Люрд: якую ж цудоўную працу вы робіце, вялікі вам дзякуй! Дзякуючы ім з’явілася жывая батлейка з удзелам людзей з інваліднасцю. Вітаю таксама студэнтаў Калабрыйскага інстытута міжнароднай палітыкі.

Я хацеў бы падзякаваць усім людзям і арганізацыям, якія ўчора мяне павіншавалі. Вялікі дзякуй! Усім жадаю добрай нядзялі: цяпер цудоўнае адвор’е.

У наступную нядзелю будуць Каляды. На гэтым тыдні, вельмі вас прашу, давайце пастараемся знайсці нейкі час на тое, каб спыніцца, крыху пабыць у цішыні, каб падумаць пра Дзеву Марыю і Юзафа, якія ідуць у Бэтлеем. Каб уявіць сабе, як яны ідуць: іхні шлях, стомленасць, але і радасць, узрушанасць, а потым клопат у пошуках месца, занепакоенасць… і гэтак далей. У гэтым вельмі дапамагае батлейка. Пастараемся ўвайсці ў сапраўднае Божае Нараджэнне, Нараджэнне Езуса, які набліжаецца да нас – Бога з намі, блізкага да нас, – каб прыняць ласку гэтага свята, ласку блізкасці, любові, пакоры і лагоднасці.

І ў гэты час не забывайцеся таксама маліцца за мяне. Смачнага абеду і да пабачэння!

*Дк. Мікола Гракаў*
*Паводле Catholic.by*

## З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:

***Вікторыя-Ядвіга Рудзенок***, дачка Віталія і Юліі
***Радзівон Жаваранак***, сын Сяргея і Анастасіі
***Марыя Галушка***, дачка Андрэя і Святланы
***Арцём-Арсеній Кіжук***, сын Аляксандра і Вольгі
***Ангеліна-Марыя Піоцці***, дачка Станіслава і Настассі
***Уладзіслаў Пыко***, сын Сяргея і Вольгі
***Вераніка Фралкова***, дачка Дзмітрыя і Анастасіі
***Ганна Пачкоўская***, дачка Дзмітрыя і Таццяны
***Філіп Кузьміч***, сын Аляксандра і Юліі
***Міраслаў Мацэвіч***, сын Андрэя і Таццяны
***Мілана-Агата Лукша***, дачка Вячаслава і Наталлі
***Дзяніс Галезнік***, сын Арцёма і Анастасіі
***Яўгеній-Герман Федарчук***, сын Сяргей і Марыны
***Вадзім-Георгій Харэвіч***, сын Максіма і Алены
***Арцём-Елісей Латыш***, сын Аляксандра і Галіны
***Уладзіслаў Зыгмантовіч***, сын Паўла і Алены
***Елізавета-Марыя Соза***, дачка Антона і Ганны
***Дзіана-Анна Хілінская***, дачка Аляксандра і Алены
***Кіра-Вераніка Тоўсцік***, дачка Дзяніса і Наталіі
***Аляксандра Акута***, дачка Дзяніса і Маргарыты
***Аліса-Аліцыя Жук***, дачка Дзмітрыя і Марыны
***Кірыл-Антоній Кутас***, сын Віктара і Антаніны
***Максім-Аўгусцін Мажэйка***, сын Аляксандра і Кацярыны
***Ян-Іоан Павел ІІ Шубовіч***, сын Юрыя і Алесі
***Аліна-Магдалена Раманчук***, дачка Андрэя і Ксеніі
***Ядвіга-Уршуля Гацак***, дачка Максіма і Надзеі
***Андрэй-Ян Павел ІІ Бажычка***, сын Станіслава і Наталлі
***Вікторыя Стасевіч,*** дачка Вячаслава і Кацярыны
***Максім Сліж***, сын Паўла і Марыны
***Марыя Пракурат***, дачка Міхаіла і Ірыны
***Яраслаў Борсук***, сын Сяргея і Людмілы
***Агнія Пуцік,*** дачка Юльяна і Веранікі
***Софія Кузняцова***, дачка Мікалая і Ганны
***Аляксей Баброўскі***, сын Аляксандра і Алены
***Роберт Пірэйка***, сын Аляксандра і Кацярыны
***Захар Аболік***, сын Юрыя і Анастасіі
***Ілля Скарына***, сын Сяргея і Валянціны
***Герман Вілітнюк***, сын Аляксандра і Агнесы
***Кацярыны Афанасьева***, дачка Аляксандра і Марыяны
***Бажэна Крывеня***, дачка Генадзія і Дар'і



**СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА**

_______ · _______ *2016 г. у* _______ · _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________________

________________________________________________________

| 26 снежня<br>Панядзелак | 27 снежня<br>Аўторак | 28 снежня<br>Серада | 29 снежня<br>Чацвер | 30 снежня<br>Пятніца | 31 снежня<br>Субота | 1 студзеня<br>Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – *<br>9.00 – *PL<br>12.00 – *<br>15.00– Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 7.00 – ✞<br>9.00 – ✞PL<br>12.00 – ✞<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – *<br>19.00 – ✞ | 7.00 – *<br>9.00 – ✞PL<br>12.00 – ✞<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 7.00 – *<br>9.00 – ✞PL<br>12.00 – ✞<br>15.00– Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 7.00 – *<br>9.00 – ✞<br>12.00 – *<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – ✞<br>19.00 – ✞ | 8.00 – *<br>9.00 – ✞<br>12.00 – *<br>15.00 – Вяч<br>17.00 – *<br>19.00 – ✞ | 8.00 – *<br>9.00 – *<br>11.00 – S<br>13.00 – *PL<br>15.00 – 👪<br>15.00 – Вяч PL<br>16.00 – *<br>17.00 – *<br>19.00 – *<br>21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым блаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** — у капліцы Маці Божай Будслаўскай
**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## У ГРОДЗЕНСКАЙ СЕМІНАРЫІ ПРОЙДУЦЬ РЭКАЛЕКЦЫІ ДЛЯ ЮНАКОЎ І МІНІСТРАНТАЎ

З 6 па 8 студзеня ў будынку Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродне адбудуцца рэкалекцыі «Распазнанне паклікання» на тэму «...Прыйшлі пакланіцца Яму (Мц 2, 2)».

Да ўдзелу запрашаюцца ўсе юнакі, а асабліва міністранты, ад 14 гадоў на перажыванне хвілін цішыні, а таксама цікавага разважання над сваім жыццёвым шляхам, каб яшчэ раз спытаць сябе ў сэрцы: да чаго мяне кліча Бог?

Аб удзеле ў рэкалекцыях просьба паведаміць да 3 студзеня – колькасць месцаў абмежаваная.

**Адказныя за рэкалекцыі**:
кс. Валерый Быкоўскі +375 (29) 695 24 69
кс. Андрэй Лішко +375 (29) 744 99 61

Запісацца на рэкалекцыі можна па тэлефоне: (8-0152) 77-02-34.

**Праграма**:

**06.01.2017**
17.00 – прыезд, размяшчэнне
18.00 – святая Імша
19.00 – вячэра
19.45 – сустрэча, знаёмства
20.30 – адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту
22.30 – адпачынак

**07.01.2017**
8.00 – пад'ём
8.30 – ранішнія малітвы
9.00 – снеданне
10.00 – канферэнцыя 1
11.00 – разважанне над Божым Словам у групах (lectio meditatio oratio contemplatio actio)
12.00 – падрыхтоўка да святой Імшы
12.15 – святая Імша
13.30 – абед
15.00 – Вяночак да Божай Міласэрнасці
16.00 – сустрэча ў групах (катэхеза)
17.00 – Літургічная сустрэча
18.00 – Ружанец
18.30 – вячэра
20.00 – адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту
22.00 – адпачынак

**08.01.2017**
8.00 – пад'ём
8.30 – ранішнія малітвы (Ютрань)
9.00 – снеданне
10.00 – канферэнцыя 2
11.00 – агульная сустрэча, падвядзенне вынікаў
12.00 – святая Імша ў катэдральным касцёле
13.30 – абед
14.00 – развітанне

Голас душы № 11–12 (536) 2016. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб'яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 24.12.2016. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф. 23, 220033 г. Мінск.